9. Slupecki, L.P. Wilkolactwo / L.P. Slupecki. – Warszawa : Iskry, 1987. – 192 s.

***Вера Мішына***

## ПРАСТОРАВАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ АБРАДАЎ СУСТРЭЧЫ ЖАНІХА І ВЫКУПУ НЯВЕСТЫ Ў СТРУКТУРЫ ТРАДЫЦЫЙНАГА БЕЛАРУСКАГА ВЯСЕЛЛЯ

Сярод традыцыйных абрадавых комплексаў сямейнага цыклу вяселле вылучаецца тым, што ў ім прымаюць удзел прадстаўнікі дзвюх сямейных груп, двух «родаў», якія, адпаведна, складаюць дзве вясельныя «партыі» – жаніха і нявесты. Логіка самога абраду патрабуе пастаяннага ўзаемадзеяння паміж дзвюма гэтымі групамі на працягу ўсяго вяселля. У сувязі з гэтым у структуры вясельнага абрадавага комплексу, побач з абрадамі, што адлюстроўваюць адносіны ўнутры вясельных «партый», вылучаецца яшчэ адна вялікая група звычаяў і абрадаў, якія «адлюстроўваюць узаемаадносіны паміж вясельнымі групамі» [7, с. 114]. М.Ф.Піліпенка адносіць да абрадаў гэтага тыпу «прыезд вясельнай групы сватоў..., замыканне варот, сімвалічныя выкупы, «павышэнне» караваяў, слоўнае спаборніцтва дзвюх вясельных груп, абмен падарункамі, злучальныя абрады і інш.» [7, с. 114].

Адносіны прадстаўнікоў дзвюх галоўных дзеючых груп вяселля – «роду» жаніха і «роду» нявесты рэалізуюцца праз апазіцыю «свой-чужы», якая з'яўляецца адным з базавых элементаў для мадэлявання рытуальнай прасторы вяселля. Значная частка вясельных абрадаў мае характар супрацьстаяння, барацьбы ці дыялогу гэтых дзвюх груп, і, па сутнасці, гэтыя адносіны ёсць узаемадачыненні «свайго» і «чужога»ў розных яго варыяцыях. Пры гэтым апазіцыя «свой-чужы» «для кожнага з двух тэкстаў успрымаецца са сваёй кропкі адліку (сіметрычна)» [3, с. 213].

Адным з найбольш яскравых элементаў, якія ўвасабляюць рытуальнае проціпастаўленне вясельных груп жаніха і нявесты, з'яўляюцца абрады сустрэчы жаніха ў доме нявесты і выкупу ім апошняй.

На тэрыторыі локуса нявесты група жаніха вымушана пераадольваць шматлікія перашкоды, якімі маркіруюцца асноўныя памежныя зоны – вароты, дзверы ў сені, уваход у хату, пры гэтым у якасці канчатковай мэты жаніх павінен атрымаць права сесці побач з маладой.

Пераадоленне кожнай з граніц становіцца магчымым толькі тады, калі жаніх ці прадстаўнікі яго «роду» выконваюць нейкія рытуальныя дзеянні, сплочваюць разнастайныя выкупы і да т. п. На кожнай з граніц жаніха спыняюць прадстаўнікі розных полаўзроставых груп. На варотах, гэта, як правіла, хлопцы: «Ля нявесціных варот... збіраюцца хлопцы лавіць «зайца». Яны загародзяць жаніху дарогу, і каб вызваліцца, жаніх павінен даць ім гарэлкі, інакш у яго коней перарэжуць гужы» [9, с. 467]. Такім чынам, вароты становяцца першымі ў сістэме граніц, якія аддзяляюць унутраную прастору двара і хаты – «сваё» ад таго, што знаходзіцца звонку – «чужога», і адкуль, уласна кажучы, і прыходзяць малады і яго дружына.

На двары, перад уваходам у хату, жаніха найчасцей сустракаюць бацькі маладой з хлебам-соллю і гарэлкай, пры гэтым яны апрануты ў вывернуты кажух. Тым самым маркіруецца кантакт са сферай «чужога», аднак паднесены пачастунак ужо мае на мэце далучэнне жаніха да уласнай прасторы і змену яго статусу на «свой». «Асваенне» жаніха магло адбывацца і праз адорванне яго атрыбутамі «свайго» – апаясванне поясам, павязванне шыйнай хусткі і да т.п. Даволі часта ў момант сустрэчы маладога бацькамі маладой у двары фігуруе і вынесены з хаты стол, за кошт чаго быццам бы працягваецца хатняя прастора і ствараецца яшчэ адна дадатковая граніца паміж дружынай маладога і «родам» нявесты.

Перад дзвярыма з сяней у хату маладога спыняюць дзяўчаты, якія. «чыняць розныя перашкоды: ставяць у парозе міску з вадой, падсоўваюць за жонку старую жанчыну» [1, с. 63].

Патрапіўшы ў хату, малады павінен пераадолець яшчэ адну прасторавую мяжу, выкупіўшы месца ля маладой за сталом, а таксама саму маладую, або яе касу. Унутраная прастора хаты нявесты становіцца месцам выканання дзеянняў ахвяравальнага характару з боку прадстаўнікоў дружыны жаніха. Так, увайшоўшы ў хату, дружка маладога «кладзе адзін пірог на слупе ля печы, які называецца стаўпец, другі на стале насупраць печы для дзяўчат, кладзе таксама тры грошы» [2, с. 68], сванька кідае чатыры калачы на ўсе куты хаты [11, с. 63]. Маладая ў гэты час «сядзіць за накрытым сталом, на ганаровым месцы, «на куце», пад іконамі» [6, с. 300]. Месца ля яе займаюць яе сяброўкі або брат, і менавіта ім дружына жаніха або ён сам павінны заплаціць выкуп за маладую або яе касу. Менавіта пасродкам выкупу, які малады плаціць сяброўкам нявесты кампенсуецца яе пераход з групы дашлюбнай моладзі ў групу замужніх жанчын [4, с. 126]. Пасля гэтага, выканаўшы яшчэ шэраг дадатковых патрабаванняў, малады атрымлівае права сесці побач з маладой [10, с. 236]. Адметна, што пакуль ідзе выкуп, малады спыняецца ля парога, не маючы пакуль што права рухацца далей. Апошнюю граніцу ў сістэме канцэнтрычных локусаў у дадзеным выпадку маркіруе стол, куды часта і змяшчаюцца грошы, пачастункі, якія прапаноўваюцца ў якасці выкупу.

Паводле позніх запісаў вясельнага абраду, на Полаччыне, пакуль выкуп не адбыўся, шаферкам забаранялася размаўляць з дружынай маладога [5, с. 232], што таксама падкрэслівае рытуальную проціпастаўленасць абрадавых груп жаніха і нявесты. Аднак, зафіксаваны і спецыфічныя рытуальныя дзеянні, якія дазвалялі маладому абысціся без выкупу. Для гэтага ён павінен быў «закінуць» шапку ці хустку за спіну маладухі, а яе сяброўкі імкнуліся гэтаму перашкодзіць [4, с. 126].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З пункту гледжання пrасторавай арганізацыі абрадаў сустрэчы і выкупу цікавасць уяўляе менавіта рух жаніха з перыферыі локусу маладой (ад варот) праз сістэму граніц (вароты, сені, парог, стол) да яго цэнтра (у дадзеным выпадку застольнай прасторы у чырвоным куце), дзе знаходзіцца маладая. Пераадоленне граніц звязана з выкананнем шматлікіх рытуальных дзеянняў ахвяравальнага і ініцыяцыйнага характару. Усё гэта дазваляе выявіць міфалагічны падтэкст вясельнага рытуалу, які знайшоў таксама ўвасабленне і ў чарадзейных казках, дзе шлях жаніха-героя да нявесты звязаны са шматлікімі выпрабаваннямі і небяспечнымі сітуацыямі. Сімвалічныя выкупы, што суправаджаюць амаль кожны з этапаў абрадавага перамяшчэння маладога, накіраваны на збліжэнне двух вясельных «родаў», усталяванне новых адносін паміж імі [8, с. 29].

Некаторым лакальным традыцыям уласцівы некалькі іншы сцэнарый прыезду маладога ў дом нявесты. Паводле яго, нявеста не чакае жаніха за сталом, яна ўвогуле адсутнічае (хаваецца). У такім выпадку жаніх павінен яе адшукаць /пазнаць сярод сябровак. У асобных апісаннях падкрэсліваецца менавіта пазнаванне (калі маладую разам з сяброўкамі накрывалі палатном, або тушылі святло, і жаніх павінен быў беспамылкова знайсці яе) [10, с. 218]. Менавіта матыў раскрывання /пазнавання нявесты ў дадзеным выпадку суадносіцца з ідэяй пераадолення проціпастаўлення «свой»-«чужы».

Такім чынам, у абрадах сустрэчы жаніха і выкупу нявесты прасторавы элемент адыгрывае надзвычай важную ролю, паколькі адлюстроўвае і падкрэслівае абарадвае супрацьпастаўленне і суперніцтва паміж прадстаўнікамі двух «родаў», якое можа быць ахарактарызавана як актуалізацыя апазіцыі «свой-чужы». Пры гэтым па меры разгортвання абраду адбываецца перамяшчэнне вясельнай групы жаніха з перыферыі локусу нявесты да яго цэнтру. Гэтае перамяшчэнне суправаджаецца паступовым зняццем дадзенага супрацьпастаўлення, «асваеннем» жаніха ў локусе нявесты.

**Спіс літаратуры:**


1. Беларускае вяселле: Абрад. Зычэнні. Тосты. Прыказкі. Фразеалагізмы : на матэрыяле Гродзеншчыны / М.А. Даніловіч, Н.К. Памецька, І.В. Піваварчык. – Гродна, 2000. – 131 с.
2. Вяселле : абрад / уклад., уступ. арт. і камент. К.А. Цвіркі. – 2-е выд. – Мн. : Беларус. навука, 2004. – 683 с.
3. Левинтон, Г.А. Мужской и женский текст в свадебном обряде / Г.А. Левинтон // Этнические стереотипы мужского и женского поведения. – СПб. : Наука, 1991. – С. 210 – 234.
4. Мішына, В.І. Сімвалічныя аспекты традыцыйнага вясельнага абраду Лепельшчыны (канец XIX – перш. пал. XX стст.) / В.І. Мішына // III Лепельскія чытанні : матэр. навук.-практ. канф., Лепель, 10 кастр. 2008 г. / адказ. за вып. Баранаў У.А., Стэльмах А.У. ; УК "Лепельскі раённы краязнаўчы музей". – Лепель, 2008. – С. 125 – 128.
5. Мішына, В.І. Структура і сімволіка традыцыйнага вясельнага абраду беларусаў цэнтральнага і заходняга Падзвіння ў 1930 – 1950-я гг. (па матэрыялах этнаграфічных экспедыцый ПДУ) / В.І. Мішына // Беларускае Падзвінне: методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку) : зб. матэр. рэсп. навук.-практ. сем., Наваполацк, 20 – 21 ліст. 2008 г. / пад. агул. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – С. 231 – 236.
6. Нравы и обычаи, народные праздники, местные поверья и предрассудки // Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Смоленская губерния / сост. генерал штаба штабс-капитан М. Цебриков. – СПб. : Тип. департамента Генштаба, 1862. – С. 258 – 316.
7. Пилипенко, М.Ф. Принципы классификации свадебной обрядности белоруссов / М.Ф. Пилипенко // Славяне и их соседи. – Мн. : Веды, 1998. – С. 111 – 115.
8. Піліпенка, М.Ф. Паходжанне і сутнасць сімвалічных выкупаў у беларускай вясельнай абраднасці / М.Ф. Піліпенка // Веснік БДУ, сер. III. – 1969. – № 3. – С. 27 – 31.
9. Романов, Е.Р. Белорусский сборник : в 9 вып. / Е.Р. Романов. – Вильна, 1912. – 600 с. – (Вып. 8 : Быт белоруса. 1886–1912).
10. Романов, Е.Р. Материалы по этнографии Гродненской губернии : в 2 вып. / Е.Р. Романов. – Вильна, 1911. – 238 с. – (Вып. 1 : 1911–1912).
11. Федароўскі, М. Люд Беларускі. Вяселле / М. Федароўскі ; уклад., прадм. і пер. з польск. мовы І.У. Саламевіча. – Мн. : Полымя, 1991. – 142 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Любоў Сівурава*

## МЕТЭАРАЛАГІЧНЫЯ ПРЫКМЕТЫ Ў ЖЫВЁЛАГАДОЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Вялікае значэнне ў жывёлагадоўчай дзейнасці беларусаў мелі метэаралагічныя прыкметы. Добрым «барометрам» селяніна служылі стан і паводзіны свойскай жывёлы. Калі каровы збіраюцца да кучы, мала п'юць вады, а днём спяць, увечары перад навальніцай хаваюцца пад дах, то гэтыя паводзіны з'яўляюцца прыкметамі дажджу. Перад дажджом быкі і каровы падымаюць пысы дагары і ўдыхаюць вільготнае паветра. Конь, прадчуваючы непагадзь, хрыпіць, пырхае. Калі ў каровы поўсць вільготная, то абавязкова будзе дождж. «*Калі карова не даець малако і вельмі махае хвастом, то назаўтра будзе дождж*»; «*Як на дождж, то кароў вечарам не падоіш, такія яны злыя*»; «*Каровы ўцякаюць з лесу на дождж*» [1, с. 80].